АДУКАЦЫЯ і ВЫХАВАННЕ 9'96



У нумары:

Пошук, даследаванне, эксперымент

Вышэйшая школа сёння і заўтра

Сярэдняя спецыяльная адукацыя

Ахова правоў дзіцяці

**В.С.Болбас,**
*кандыдат педагагічных навук, выкладчык Мазырскага дзяржаўнага педінстытута*

# Дабрачыннасцей сад

## Маральна-выхаваўчыя ідэі аўтара першага айчыннага падручніка па этыцы Яна Ліцынія Намыслоўскага

У другой палове XVI ст. шырокую вядомасць і славу набыла на Міншчыне іўеўская арыянская школа, якую ўзначальваў таленавіты педагог і актыўны грамадскі дзеяч Ян Ліцыній Намыслоўскі. Маючы на мэце прысвяціць сваё жыццё справе барацьбы за здзяйсненне ідэй левага рацыяналістычнага крыла рэфармацыі, якое ўзначальваў наш зямляк Сымон Будны, Ліцыній пераехаў з Вялікага княства Літоўскага з сілезскага горада Намыслаў. Такі крок маладога арыянскага дзеяча сведчыць аб тым, што на Беларусі ў той час сфармаваліся спрыяльныя ўмовы для ажыццяўлення перадавой асветніцкай дзейнасці. Асноўны кантынгент вучняў іўеўскай школы складалі дзеці навакольнай шляхты і мяшчан. Гэта была адна з першых школ на беларускіх землях, дзе закладваліся асновы свецкай адукацыі. У адпаведнасці з распрацаванай Янам Намыслоўскім праграмай школьнікі вывучалі тагачасныя і старажытныя мовы, антычнасць, этыку, логіку, права, арыфметыку і іншыя дысцыпліны. Свяшчэннае пісанне як асобны прадмет у праграме не ўпамінаецца. Адукацыя, якую атрымлівалі вучні, насіла гуманістычны характар. Як падкрэсліваюць даследчыкі, гэтая школа ў многім апярэдзіла тагачасныя езуіцкія, брацкія і кальвініцкія дзякуючы глыбокаму вывучэнню асноў навук і ўласціваму ёй духу гуманізму і грамадзянскага выхавання.

Ліцыній спецыяльна для сваіх навучэнцаў піша і выдае вучэбныя кнігі, першай з якіх быў вучэбны дапаможнік па логіцы. Пры выкладанні асноў арыстоцелевай логікі педагог дэманструе ўзор пабудовы лагічных канструкцый, з дапамогай якіх абгрунтавана абвяргае асобныя стэрэатыпы светаўспрымання. Амаль дэістычныя погляды на рэлігію выяўляе Ян Ліцыній у працэсе вуснай і пісьмовай палемікі з актывістамі езуіцкага ордэна, што яшчэ раз сведчыць аб існаванні антыдагматычнага духу выхавання ў іўеўскай школе. Ажыццяўляючы на практыцы ідэі С.Буднага аб асвеце народа, школа Я.Намыслоўскага давала вучням не толькі веды, але і фармавала людзей новага часу, выхоўвала ў іх вальнадумства, рэлігійны скептыцызм і павагу да чалавечага розуму.

Узброены перадавымі метадамі навучання і выхавання іўеўскі педагог на практыцы садзейнічае станаўленню свецкай асобы — носьбіта новага светапогляду, новай маралі. З выхаваўча-асветнымі мэтамі Ян Ліцыній піша другі вучэбны дапаможнік, поўная назва якога “Сентэнцыі для агульнага ўжывання ў жыцці, усім не бескарысныя, якія можна прапаноўваць пераважна вучнёўскай моладзі, у лацінскіх, польскіх і нямецкіх вершах выказаныя”. У 1589 г. падручнік выдае друкар Лоскай друкарні (цяпер Валожынскі раён), прадаўжальнік выдавецкіх традыцый Ф.Скарыны Ян Карцан. Гэта быў прак-

тычна першы айчынны зборнік маралізатарскіх выказванняў, якія Намыслоўскі часткова склаў сам, часткова запазычыў з іншых крыніц і пасля апрацоўкі і перакладу на тры мовы змясціў у падручніку. У прадмове да гэтай кнігі Сымон Будны даў высокую ацэнку працы і рэкамендаваў моладзі ў аснову сваіх жыццёвых учынкаў класці запаветы Ліцынія. У аўтарскай жа прадмове Я.Намыслоўскі падкрэслівае карыснасць маральных правіл і ў маладосці, і ў сталым узросце.

У кнізе змешчана 225 павучанняў, напісаных у вершаванай форме. Кожная сентэнцыя мае свой загаловак і парадкавы нумар. Падобны этычны зборнік быў не толькі першым на Беларусі, ён не меў аналагаў і ў іншых краінах. Ліцыній меў намер сфармуляваць адзіныя маральныя прынцыпы і ўстаноўкі для ўсяго грамадства, без уліку канфесійных адрозненняў і класавых размежаванняў. Такім чынам, гэта была спроба распрацоўкі простых, асноватворных норм і правіл арганізацыі чалавечага жыцця, што мае непераходзячае значэнне, бо ў шырокай гістарычнай перспектыве агульначалавечыя маральныя нормы ў цэлым маюць значную перавагу над вузкакласавымі ці пабудаванымі на ідэях пэўнай рэлігійнай плыні. А сёння значнасць і слушнасць гэтага палажэння адчуваецца асабліва востра.

Змест "Сентэнцый..." прасякнуты глыбокай верай у чалавека, яго разумовыя здольнасці і магчымасці. Прытрымліваючыся класічнай арыстоцелеўскай схемы дзялення дабрачыннасцей на дзве групы — інтэлектуальныя і маральныя, Я.Намыслоўскі напаўняе іх жыццесцвярджальнай сілай і сацыяльна-практычнай значнасцю. Даволі выразна ў павучаннях педагога выступае скіраванасць да вызначэння сэнсу жыцця, абгрунтавання неабходнасці належнай арганізацыі штодзённага побыту. У адной з сентэнцый "Аб смерці" ён падкрэслівае: "Не абяцай жа сабе бясконцыя часіны жыцця", дапаўняючы, што "смерць нічога не абяцае" [3, *174*], чым арыентуе чалавека на гэтасветнае існаванне, свабоднае ад ілюзорных надзей на змяненне лёсу па-за межамі зямнога быцця. Але было б неапраўданым перабольшваннем прыпісваць Ліцынію атэістычныя погляды ў фармаванні этычнай канцэпцыі грамадскага існавання, бо амаль у сарака сентэнцыях ён у той ці іншай форме паказвае сваю прыхільнасць да рэлігіі. Больш таго, як бы не задавальняючыся магчымасцямі чалавека самаму кантраляваць свае паводзіны, ён у якасці суддзяў выстаўляе звышнатуральныя нябесныя сілы, якія падтрымліваюць дабрачыннасць і караюць за правіннасць.

У той жа час вучоны-педагог падкрэсліваў, што правільнасць маральных прадпісанняў правяраецца жыццём і што ў першую чаргу народ з'яўляецца носьбітам вывераных маральна-выхаваўчых ідэй. Вось чаму ён акцэнтаваў увагу на беражлівых адносінах да выхаваўчага народнага вопыту: "ісцінае тое слова, якім у народных вуснах ганяць" [3, *181*].

Намыслоўскі поўнасцю падзяляў думку паслядоўнікаў Ф.Скарыны, што сэнс чалавечага існавання скрыты ў высокамаральным жыцці асобы. Ён быў перакананы: "Дабрачыннасць шчаслівых нараджае" [3, *179*]. Не выпадкова галоўную мэту жыцця для сваіх выхаванцаў ён сфармуляваў наступным чынам: "Няма нічога ва ўсім свеце каштоўней, чым дабрачыннасць. Да яе імкніся, іншым жа грэбуй" [3, *180*]. З гэтай нагоды ўвесь свой талент вучонага і педагога Ліцыній аддаў справе выхавання дзяцей. Ён быў глыбока перакананы ў велізарных магчымасцях школы і настаўнікаў у гэтым накірунку. У іўеўскай школе менавіта выхаванню надавалася першарадная ўвага. Ліцыній пісаў, што ў ліхія гадзіны патрэбны востры меч і надзейны шчыт, але найбольш неабходным з'яўляецца дух чалавека.

Дарэчы, такія погляды знаходзілі адэкватнае адлюстраванне ў дзейнасці многіх вучэбных устаноў Беларусі, асабліва брацкіх і пратэстанцкіх школ. У архівах захаваўся цікавы дакумент з абавязацельствамі рэктара адной з іх перад бацькамі і грамадскасцю. І хаця гэты матэрыял мае непасрэднае дачыненне да Львоўскай школы, аднак яго ў поўнай меры можна распаўсюдзіць і на іншыя аналагічныя школы, бо па сутнасці яны былі аднатыпнымі. Гэтыя абавязацельствы кіраўніка вучэбнай установы падкрэсліваюць, што ў школах першараднае значэнне ўдзялялася пытанням выхавання: "...Буду навучаць іх, дзяцей, па-першае, першую філасофію — баязнь бога... Па-другое, належную любоў і павагу да бацькоў і да ўсіх старэйшых і братоў у Хрысце, па-трэцяе, грэчаскай пісьменнасці і мове..." [6, *54*].

Ліцыній разумеў важнасць мэтанакіраванасці ў арганізацыі любога віду дзейнасці, у тым ліку і ў выхаванні дзяцей. У сваім вучэбным дапаможніку па этыцы ён пісаў: "Не бярыся наўдалую што-небудзь рабіць, даследуй прычыны, потым прадумай мэту, будзеш заўсёды непашкоджаным" [3, *181*]. Падкрэсліваў, што "трэба рабіць толькі тое, мэту чаго бачыш загадзя" [3, *180*].

Галоўнай мэтай маральна-выхаваўчага працэсу Намыслоўскі бачыў не проста ўзбраенне дзяцей веданнем пэўных маральных норм і правіл. У поўнай адпаведнасці з палажэннем хрысціянскай этыкі і асноўнымі формуламі народнай педагогікі ён настойліва праводзіў думку аб тым, што маральнасць асобы вымяраецца яе паводзінамі, канкрэтнымі справамі. Таму пры распрацоўцы тэарэтычных пытанняў маральнага выхавання Ліцыній перш за ўсё жадаў ажыццяўлення іх у жыцці. Ён пісаў: "Няхай увасобяцца ў справах думкі вучоных людзей" [3, *175*]. Адказваючы на пытанне, якім шляхам можна набыць пашану з боку грамадства, галоўны акцэнт педагог рабіў на дзейсны бок маральнасці чалавека. У даслоўным перакладзе з нямецкай мовы адна з сентэнцый Я.Намыслоўскага гучыць так: "Той высакародны, хто здзяйсняе высакародныя справы" [4, *188*]. На думку мысліцеля, дабрачыннасць з'яўляецца гэткай не сама па сабе, а толькі будучы рэалізаванай у высокамаральных учынках. Аб маральных якасцях асобы патрэбна судзіць не па яе манерах і нават намерах, а па канкрэтных справах. Нездарма ж кажуць, што добрымі намерамі вымашчана дарога ў пекла. Таму адну з сентэнцый аўтар фармулюе так: "Каштоўна не тое, што словамі найлепшымі нам абяцаюць, дорага па- сапраўднаму толькі тое, што пастаўляюць зараз" [3, *177*]. Такім чынам, этычная канцэпцыя слыннага педагога набывае абрысы актыўнай дзейснай сістэмы.

Змястоўны бок хрысціянскай этыкі ў спалучэнні з усходнеславянскімі традыцыямі прыводзілі Я.Л.Намыслоўскага да высновы, што адным з найважнейшых кірункаў маральнага выхавання павінна быць выхаванне дружалюбнасці, імкнення да абшчыннасці, згуртаванасці. Супольнае жыццё, таварыская ўзаемадапамога, на думку гуманіста, з'ўляюцца істотнымі састаўляючымі чалавечага шчасця. А патрэбны яны кожнаму і ў радасці, і ў горы. Ліцыній катэгарычна заяўляў, што "няма нічога мацней за дружбу" [3, *174*]. Таму ён павучаў моладзь: "Дружбу надзейна захоўвай, як сумны надыдзе час, на выручку дружба прыйдзе, ласкай смутак аблегчыць" [3, *180*].

Трэба адзначыць, што ў адрозненне ад артадаксальна-хрысціянскіх мысліцеляў, якія супольнасць, абсалют, цэлае ставілі недасягальна вышэй індывідуума, пры практычным ігнараванні інтарэсаў апошняга, Ліцыній аддаваў перавагу грамадскім інтарэсам, але здолеў не растварыць у іх канкрэтную чалавечую асобу. "Кожнага да ўласных дзеянняў схіляе прырода" [3, *186*], — лічыў ён. Працягваючы традыцыі дзеячаў эпохі Адраджэння

ва ўслаўленні інтэлектуалізму прыстойнай асобы, Ян Ліцыній Намыслоўскі будуе ў асноўным мадэль суб'ектыўнай маралі, — маралі, якой павінны карыстацца канкрэтныя асобы ў сваіх узаемаадносінах.

У сваю чаргу, скіраванасць маральнасці чалавека да агульнага дабра, асаблівасці менталітэту беларускага народа акцэнтавалі ўвагу арыянскага дзеяча на фармаванні ў кожнага чалавека патрыятычных пачуццяў, этнічна-нацыянальнай і грамадзянскай годнасці. Пад уздзеяннем такіх ідэй любоў да радзімы, яе народа набывае ў Намыслоўскага выразнае героіка-патрыятычнае гучанне. У сваіх сентэнцыях для юнацтва ён абгрунтоўваў думку, што дзеля шчасця радзімы чалавек можа ахвяраваць нават сваім жыццём. "Кожны, хто сумленны, гарыць такой любоўю да айчыны, — пісаў Ліцыній, — што бяззбройны гатовы кінуцца ў полымя вогнішча" [3, *173*].

Мысліцель вельмі падрабязна апісваў, якімі маральнымі якасцямі павінен валодаць прыстойны чалавек, і асобнае месца адводзіў выхаванню сумленнасці і праўдзівасці ў вучняў сваёй школы. У падручніку па этыцы ён пісаў: "Не высакародна падманваць, хлусню прыхарошваць словам: д'ябальскі гэта прыём тых, хто каварны як нячысты" [3, *178*]. "Сумленнасці дух", "мова праўды", на думку педагога, дапамагаюць дасягнуць маральных вяршынь. Багацце гэтых маральных якасцей з'яўляецца непараўнальна больш каштоўным, чым матэрыяльныя скарбы заможных людзей. Таму вучоны заключае: "Намнога важней і каштоўней бескарыслівая сумленнасць у бедных людзей, чым золата тых багацеяў, што подла набылі свой скарб" [3, *182*].

Хрысціянскае вытлумачэнне першароднага граху наклала адбітак на ўяўленні педагога аб маральнай сапсаванасці чалавечай прыроды. Таму Ліцыній быў упэўнены, што патрэбна. прыкладаць вельмі вялікія намаганні па прывіцці вышэйадзначаных якасцей, бо, на яго думку, "па прыродзе падман уласцівы людзям спрадвеку" [3, *183*].

Згодна з асноўнымі формуламі народнай педагогікі і пастулатаў хрысціянскай этыкі, Я.Намыслоўскі асаблівую ўвагу канцэнтруе на неабходнасці выхавання самых простых, першасных норм маралі, якія як бы складаюць яе азбуку і ўтвараюць трывалы падмурак маральнай дасканаласці чалавека. Да ліку такіх адносіліся павага і шанаванне бацькоў і старэйшых. Мараліст павучаў сваіх вучняў: "Старых вучыся паважаць... Старэйшаму шлях уступі, пашкадуй жа тых, хто слабейшы, роўных сабе паважай, зможаш надзейна пражыць" [3, *172*]. Гэткім жа духам прасякнута значная частка яго сентэнцый. "Калі ўбачыш старца, то хоць і не ведаеш яго, — пісаў Ліцыній, — аднясіся да яго з павагай" [3, *184*].

Важна адзначыць, што гуманістычная інтэнцыя эпохі расставіла свае акцэнты ў разуменні традыцыйных хрысціянскіх дабрачыннасцей. Так, напрыклад, згодна з біблейскімі запаветамі, Намыслоўскі заклікаў да выхавання цярплівасці, пакорлівасці. Адна з яго сентэнцый сфармулявана так: "Гора любое, бяду скрышыць зможа толькі цярпенне. Усё, калі пераадолець хочаш, цярпець навучыся" [3, *187*]. Разам з тым мысліцель перасцерагаў, што да выхавання гэтай якасці трэба падыходзіць асцярожна. Неабходна ўяўляць межы цярплівасці, бо "часта лопнуўшае цярпенне ў раз'юшаны гнеў пераходзіць" [3, *178*]. Вось чаму побач з цярплівасцю, паслухмянасцю, сціпласцю Я.Намыслоўскі хацеў выхаваць у сваіх гадаванцах жыццярадаснасць, бадзёрасць, мэтанакіраванасць. Даволі трапна ён абгрунтоўвае думку, што "сум пажырае мазгі" [3, *172*].

Растлумачваючы сэнс адной з важнейшых хрысціянскіх дабрачыннасцей — шчодрасці, Ліцыній перасцерагае ад бяздумнага яе выкарыстання ў жыцці. Ён быў далёкі ад арыстакратычнага разумення

шчодрасці, якая даходзіла падчас да наўмыснага, паказнога ханжаства. Утылітарызацыя маральнасці мяняла сутнасць гэтага паняцця. Слынны педагог павучаў: "Шчодрым не будзь, не спрыяй людзям несумленным" [3, *172*]. Як і іншыя беларускія мысліцелі, ён слушна заўважаў, што ва ўсім павінна быць пачуццё меры. Згодна з Арыстоцелем, пісаў: "Усялякіх празмернасцей заганых спрабуй, падумаўшы, пазбегнуць, меру вартасці ведай — яму сярэдзіну захоўваць" [3, *177*].

Належнае месца ў змесце маральнага выхавання адводзіў Намыслоўскі такім якасцям, як настойлівасць і ўпартасць. Ён сцвярджаў, што без іх немагчыма дасягнуць у жыцці ні адной з пастаўленых мэт. Асветнік прыводзіць прыклад аб ролі ўпартасці, настойлівасці і працалюбства ў імкненні авалодаць вяршынямі навукі. Падагульняючы разважанні на гэтую тэму, ён заключае: "Запал, ведайце, дарэмны ад мастацтва навукі высокай, будзе навука расці, ад дбайнасці нашай працы" [3, *173*].

Яўна рэнесансныя матывы гучаць у поглядах мысліцеля аб выхаванні ў чалавеку асэнсаваных, удумлівых адносін да рэчаіснасці, аб месцы і ролі кожнага індывіда ў сацыяльна-грамадскіх працэсах, самааналізе і самакрытычнасці. На яго думку, без гэтых якасцей немагчыма маральнае развіццё чалавека наогул. "Высакародны і мудры той, хто прымае крытыку да сэрца, — вучыў педагог сваіх выхаванцаў, — хто ставіцца з пагардай да папроку, той глупства песціць у галаве" [3, *178*]. Асабліва павінен валодаць гэтай якасцю той, хто хоча выхоўваць іншых: "Калі вінаваціць пажадаеш, глядзі каб сам быў бязгрэшны" [3, *186*]. Гэта значыць, што маральнасць чалавека перш за ўсё праяўляецца тады, калі ён ацэньвае і судзіць спачатку сябе, а потым іншых.

Пры апоры на вопыт народа, дасягненні антычнай і хрысціянскай этыкі, улічваючы ідэі сучасных яму вучоных, Ян Намыслоўскі не толькі распрацоўваў сістэму станоўчых маральных якасцей, якія складалі змест маральна-выхаваўчага працэсу, але вялікую ўвагу ўдзяліў раскрыццю адмоўных рыс, што, з аднаго боку, з'яўляюцца перашкодай у фармаванні высокамаральнай асобы і наносяць шкоду грамадству ў цэлым, а з другога — з'яўляюцца тымі прыступкамі, пераадоленне якіх садзейнічае больш трываламу ўмацаванню маральных якасцей.

Рэзкай крытыцы падвяргае вучоны-педагог асабліва распаўсюджаную маральную хваробу — сквапнасць, непамернае імкненне да багацця. Ліцыній адзначаў разбуральны ўплыў на асобу "сребролюбия", хцівасці і падкрэсліваў, што "прагнасць не ведае межаў" [3, *173*]. Прычым гэта такія якасці, ад якіх цяжка збавіцца і да "сівавалосых гадоў" [3, *185*]. На думку асветніка, імкненне да абагачэння, як правіла, выводзіць чалавека на сцежку несумленнага набыцця іх, што напрамую вядзе да псавання ўсяго добрага, што ёсць у чалавеку. "Хто зграбае выгоды для сябе шляхам ушчамлення іншых, — пісаў Я. Намыслоўскі, — той дабрачыннасць і сорам не дапускае да сябе" [3, *177*]. Ён папярэджваў, што павага і пашана, якія трымаюцца на багацці ці іерархічным становішчы, знікаюць разам са смерцю іх уладара, а слава і доблесць, як вынік уласнай дабрачыннасці, гэта значыць набытыя сумленным шляхам, — бессмяротныя.

Як і іншыя айчынныя педагогі, Намыслоўскі асабліва рэзка асуджаў цягу да алкаголю. Галоўную небяспечнасць п'янства ён бачыў у тым, што яно з'яўляецца пажыўнай глебай развіцця многіх адмоўных рыс і якасцей асобы. Ліцыній пісаў: "Цвярозасць, годнасцей абаронца, заганы выганяе, п'янства, зладзейства ж маці, зло нараджае заўсёды" [3, *181*]. На яго думку, грамадства ад п'янства нясе непараўнальна большыя

страты, чым ад самых спусташальных войнаў.

Намыслоўскі вітаў прынесенае Адраджэннем абуджэнне ўласнай годнасці кожнай асобы, разам з тым лічыў недапушчальным яе перарастанне ў сябелюбства, фанабэрыю, пыхлівасць, якія перашкаджалі маральнаму ўдасканаленню чалавека. "Усялякую фанабэрыю, гардыню па праву заганай лічаць" [3, *179*], — пісаў мысліцель. Аналагічным чынам падыходзіў ён і да раскрыцця такіх чалавечых заган, як зайздрасць, марнатраўства, паклёпніцтва, гультайства, падлізванне, балбатлівасць і інш.

Сентэнцыі Я.Намыслоўскага накіраваны на глыбокае ўсебаковае асэнсаванне маральных дабрачыннасцей, уменне правесці граніцу паміж дабром і злом, падпарадкаванне паводзін, выпрацаваных, такім чынам, законам сумлення. Чалавек павінен унікаць у сутнасць з'яў і рэчаў, умець распазнаваць, кім на самай справе з'яўляецца той, хто прываблівае толькі знешнім выглядам. "Часта ў прыгожай, зграбнай вопратцы дурань выступае, — пісаў Ліцыній, — а ў неахайнай — мудрэц хавае велічы дух" [3, *182*].

Ажыццяўляючы на практыцы асветныя намеры перадавых слаёў насельніцтва, слынны педагог усхваляў чалавечы розум, праслаўляў веды, якія лічыў асновай маральнасці індывіда. "Сее ж сілу сваю розум у дабрачыннасцей сад" [3, *175*], — пісаў Ліцыній. Вучоны-педагог імкнуўся надзяліць сваіх выхаванцаў той цывілізуючай сілай, якая здольна далучыць іх да бясцэнных духоўных скарбаў, паказаць шлях да сапраўднага шчасця. Веды, мудрасць — галоўнае багацце ў жыцці, лепшага дастатку чалавеку не трэба і жадаць. Таму моладзі ён даваў параду: "... Навуку шукай пастаянна" [3, *179*]. Да абурэння даходзіў аўтар "Сентэнцый...", калі разважаў аб тым, што многія людзі не шануюць сілу розуму і не спяшаюцца яго развіваць. "Дзе ж прычына, што людзі з клопатам аб розуме марудзяць, — пісаў асветнік, — відаць, ім няўцям, як каштоўны развіты розум" [3, *182*]. Школьны настаўнік, ён па-сапраўднаму разумеў і цану ведаў, і якім чынам можна іх набыць, таму перасцерагаў ад неглыбокага, легкадумнага падыходу да такога працэсу. Як актуальна гучыць сёння яго папярэджанне ад паказнога захаплення фармальным бокам справы: "Калі валодаеш мноствам кніг без разбору, не думай, што заслужыў ты слаўнае імя вучонага мужа" [3, *185*].

У процівагу евангелічнаму выгнанню з сістэмы дадатных рыс асобы імкненняў да ведаў Я.Намыслоўскі бачыў у гэтым галоўны шлях і важнейшую ўмову маральнага фармавання індывіда і грамадства ў цэлым. Неаднаразова ён супрацьпастаўляе матэрыяльныя багацці і духоўныя скарбы і робіць катэгарычны вывад: "Не, не багацце нараджае розум высакародных людзей, розум жа, наадварот, ёсць невычарпальны скарб" [3, *173*]. Такі зварот да розуму ў маральным развіцці накладваў істотны адбітак і на практычную арганізацыю маральна-выхаваўчага працэсу. Значную ўдзельную вагу ў школе Я.Намыслоўскага, як і ў многіх іншых навучальных установах таго часу, надавалі непасрэдна маральнай асвеце вучняў. Вельмі распаўсюджаным прыёмам было завучванне маральных правіл на памяць.

Але ж Я.Намыслоўскі, як і іншыя беларускія мысліцелі, не лічыць чалавека бяздумным выканаўцам імператыўных маральных прадпісанняў. Ён акцэнтуе ўвагу на выхаванні актыўнасці асобы, крытычнага падыходу да знешніх маральных установак. На думку вучонага, "выхаванцы павінны фармаваць свае паводзіны шляхам уважлівых адносін да "меркаванняў", парад іншых, дакладна ўзважыўшы іх" [3, *183*].

З усяго сказанага бачна, як адносіўся Я.Намыслоўскі да развіцця розуму і адукаванасці. І ўсё ж, лічыць педагог, гэта не з'яўляецца вызначальным пры

маральнай ацэнцы асобы. У адной са сваіх сентэнцый ён папярэджваў моладзь, што вучонасці яшчэ зусім не досыць, каб стаць прыстойным чалавекам. Калі “невукі добрых нораваў прытрымліваюцца”, то яны будуць больш пажаданымі для грамадства, чым “муж вучоны”, якога “зло, агідная справа слепіць” [3, *176*].

Ліцыній разумеў велізарныя выхаваўчыя магчымасці школы ў фармаванні дасканалай асобы. Менавіта таму і аддаў ён значную частку свайго свядомага жыцця арганізацыі гэтай справы. Як і яго калегі са Слуцкай гімназіі, ён глядзеў на школу як на “майстэрню чалавечых душ”. Для школы Я.Намыслоўскага, як і для іншых аналагічных навучальных устаноў, была характэрная спецыяльная арганізацыя выхаваўчай работы ў час вучэбных заняткаў. Выдзяляўся таксама асобны час і для выхаваўчых мерапрыемстваў. “По вечерни въ субботу маеть дидаскалъ зъ детьми помовлятися часъ немалый, болше нижъ въ дни иные, учати ижъ страху Божію и обычаемъ встыдливымъ младенческимъ” [1,*183*] — такія патрабаванні прад’яўляліся да настаўнікаў. Гэта была значная пераарыентацыя вучэбных устаноў у бок маральна-выхаваўчай дзейнасці, бо ў час свайго паяўлення школы ствараліся ў асноўным з адукацыйнымі мэтамі.

Пры акрэсленні шляхоў маральнага выхавання асабліва вялікую ўвагу Я.Намыслоўскі ўдзяляў характару адносін да дзяцей. Багаты педагагічны вопыт даваў яму магчымасць узважана і прадумана падыходзіць да распрацоўкі патрабаванняў у гэтым напрамку. Ён катэгарычна адвяргаў пастулат аб неабходнасці трымаць дзяцей у страху. “Калі не хочаш быць пудзілам, то аб любові клапаціся, — пісаў Ліцыній, — смерці жадаюць таму, хто выклікае толькі страх” [3, *174*]. Мысліцель раіў настаўніку дабівацца павагі да сябе з боку навучэнцаў. Толькі дзякуючы гуманным адносінам да дзяцей можна чакаць адпаведных адносін да сябе. І толькі ў гэтым выпадку настаўнік можа дабіцца жадаемых вынікаў. “Шчырай пяшчотай ласкавых нораваў дабыць можна столькі, — пісаў педагог, — колькі іншым шляхам дабыць немагчыма” [3, *184*]. Калі ж адносіцца да дзяцей сурова, груба, то “варварскай грубасці хто ж сэрца адкрые сваё” [3, *182*].

Поспех выхаваўчай работы ў многім залежыць ад дакладнай паслядоўнасці яе ажыццяўлення. “Правільна не зробіш нічога, — развучаў Я.Намыслоўскі, — калі не прадумаеш парадку” [3, *174*]. Аддаючы належнае складанасці арганізацыі маральнага выхавання, мысліцель удзяляў вялікую ўвагу сістэматычнасці, інтэнсіўнасці ўздзеяння на выхаванцаў. Распрацоўшчык тэарэтычных асноў маральнага выхавання быў перакананы, што пры пасільных задачах настойлівасць і ўпартасць, якія абапіраюцца на абгрунтаваныя падыходы, прынясуць добрыя вынікі. Важна толькі даводзіць справу да канца, не спыняцца на паўдарозе. “Пачатае трэба заканчваць” [3, *179*], — пісаў ён.

У іўеўскай школе шырокі ўжытак у выхаваўчай рабоце знаходзіў метад прыкладу. Гэта быў адзін з самых распаўсюджаных метадаў выхавання ў тагачасных школах падобнага тыпу. Так, у адным з вучэбных дапаможнікаў Слуцкай гімназіі гаворыцца аб тым, што калі настаўнік “хоча стаць вядомым як карысны выхавацель даручанага яму юнацтва”, ён павінен арганізоўваць адпаведнае педагагічнае ўздзеянне на вучняў “шляхам спасылкі на нешматлікія правілы і добрыя прыклады... Так, нарэшце, як бы з дапамогай прывабных узораў будуць заваёваны душы...” [2, *100*].

Важкі ўклад быў унесены Я.Намыслоўскім у абгрунтаванне пытання аб выкарыстанні пакаранняў у школе. Вучоны-педагог падтрымліваў і культываваў ідэю шкоднасці для фармавання

асобы фізічных пакаранняў. Як выключэнне, у іўеўскай школе дапускалася іх прымяненне для малодшых школьнікаў, а выкарыстанне фізічных пакаранняў пры выхаванні старэйшых школьнікаў катэгарычна забаранялася. Я.Намыслоўскі са сваімі настаўнікамі нават спрабавалі ўдасканаліць педагагічную сістэму нямецкага рэфарматара Іагана Штурма. А як вядома, І.Штурм у гэтых адносінах стаяў на такіх прынцыповых пазіцыях: "Быць пакараным і высцябаным бізунамі — ёсць уніжэнне, і хоць большай часткі вучняў уласцівы хібы характару... трэба падумаць, ці прывядзе да выпраўлення нораваў фізічны боль, бо ён цяжэй для духу, чым для цела" [5, *189*].

Да дзейснага метаду маральнага выхавання адносіў педагог выкарыстанне ўзнагарод і заахвочванняў. Працейшымі з іх лічыліся адабрэнне і пахвала. Лічылася, што вышэйшай узнагародай за дабрачынныя паводзіны з'яўляецца павага з боку навакольных. "Акрамя пашаны, узнагароды за доблесць не чакай, — пісаў Я.Намыслоўскі, — гонару хопіць аднаго, — доблесць не прагне іншай" [3, *180*].

Ліцыній з павагай адносіцца да любой працы. Ён заклікае да "стараннай", "пільнай" працы, хаця напрамую і не звязвае гэта з маральным станаўленнем чалавека. Ды і наогул, паміж радкоў яго павучанняў можна прачытаць пра пэўную элітарнасць, перавагу разумовай працы над фізічнай. Працавітасць — крыніца ўсіх багаццяў чалавека, але, баючыся, каб іх матэрыяльная частка не стала галоўнай мэтай жыцця, ён рашуча пратэстуе супраць дэфармуючага ўздзеяння ўласніцкіх схільнасцей на маральную прыроду людзей.

У сваіх "Сентэнцыях..." Я.Намыслоўскі адводзіць маральнай сістэме практычна неабмежаваную вобласць прымянення. Ён пераконвае чытачоў, што мараль украпана ва ўсе віды дзейнасці і адносін людзей, і ў той жа час цесным чынам звязана з усімі элементамі іх унутранага свету. У гэтым універсальным характары маралі, па разуменні Ліцынія, закладзена магчымасць гармануючага яе ўздзеяння на чалавека. Гэта і была адна з галоўных задач пры напісанні разглядаемай кнігі.

Аб тым, што педагог дасягнуў сваіх мэт, сведчыць тое, што яго "Сентэнцыі..." карысталіся шырокай папулярнасцю ў моладзі Вялікага княства Літоўскага і нават за яго межамі. Апалагеты ж рэакцыйна-дагматычных устояў здолелі разгледзець у поглядах Я.Намыслоўскага недапушчальнае вальнадумства і арыентацыю на актыўную дзейнасць па перабудове грамадства. Так, у 1596 г. галандскі багаслоў Ф.Юніус выдае кнігу, дзе папярэджвае магнатаў Беларусі аб небяспецы, якая зыходзіць для грамадства з поглядаў Яна Ліцынія Намыслоўскага. І сёння цікавасць да гэтай кнігі — першага айчыннага падручніка па этыцы і замежных мовах, які і да ідэй яе аўтара — знакамітага вучонага-педагога — павінна аказаць пэўную дапамогу ў развіцці асветна-выхаваўчай работы і росквіце культуры роднага края.

1. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией: В 5 т. — СПб., 1865. — Т. 2.

2. Антология педагогической мысли Белорусской ССР. — М., 1986.

3. *Намыслоўскі Я.Л.* Сентэнцыі для агульнага ўжывання ў жыцці. — Лоск, 1959 // Беларуская літаратура (Гомельскі дзярж. ун-т). — 1983, №1.

4. *Парэцкі Я.І.* Іўеўскі педагог Ян Ліцыній Намыслоўскі // Беларуская літаратура (Гомельскі дзярж. ун-т). — 1983, №11. — С. 169—171, 187—190.

5. *Порецкий Я.И.* Устав Слуцкого лицея // Методы обучения иноязычной речи. — Мінск, 1972. — Вып. 2. — С. 185—197.

6. ЦДГА Укр. (Л.) — Ф. 129, воп. 2, спр. 54.